ЗАЦВЯРДЖАЮ
намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама
С.В. Куратчык
28 крысавіка 2021 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю” ў рамках моладзевага выставачнага праекта “Казкі і паданні майго краю”**
*(у новай рэдакцыі)*

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю” ў рамках моладзевага выставачнага праекта “Казкі і паданні майго краю” (далей – Выстаўка-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: адраджэнне, захаванне і папулярызацыя вуснай народнай творчасці Гродзеншчыны сродкамі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва праз вобразы казачных герояў, міфічных істот, якія яскрава раскрываюць існасць мясцовых легенд і паданняў; выяўленне і падтрымка таленавітых дзяцей і моладзі; стварэнне спрыяльных умоў для самарэалізацыі асобы; раскрыццё мастацкага патэнцыялу дзяцей і моладзі ў розных відах і жанрах народнай творчасці; далучэнне дзяцей і моладзі да лепшых узораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; фарміраванне ідэйна-мастацкага ўзроўню і эстэтычнага густу дзяцей і моладзі; папулярызацыя беларускай нацыянальнай культуры і яе інтэграцыя ў дзіцячае і моладзевае асяроддзе.

3. Арганізатарамі Выстаўкі-конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Выстаўкі-конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (Дадатак 1).

5. Аргкамітэт:

5.1. уносіць на разгляд упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне Выстаўкі-конкурсу, умовах правядзення Выстаўкі-конкурсу і відах заахвочвання ўдзельнікаў;

5.2. узгадняе склад рэжысёрска-пастановачнай групы, склад журы Выстаўкі-конкурсу, спіс удзельнікаў Выстаўкі-конкурсу, праграму правядзення Выстаўкі-конкурсу, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Выстаўкі-конкурсу;

5.3. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі Выстаўкі-конкурсу;

5.4. вырашае іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем Выстаўкі-конкурсу.

6. У Выстаўцы-конкурсе прымаюць удзел дзеці, падлеткі і моладзь (ад 7 да 31 года) – удзельнікі гурткоў і студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, вучні дзіцячых мастацкіх школ і школ мастацтваў, навучэнцы сярэдніх спецыяльных і студэнты вышэйшых навучальных устаноў, асобныя таленавітыя канкурсанты.

7. Выстаўка-конкурс праводзіцца ў два этапы: 1 этап (адборачны) – адбор работ канкурсантаў па фотаздымках; 2 этап (заключны) – праводзіцца з 10 красавіка па 29 мая 2021 г. у ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

8. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў Выстаўкі-конкурсу адбудзецца 29 мая 2021 г. у г.Гродна падчас правядзення заключных мерапрыемстваў моладзевага выставачнага праекта “Казкі і паданні майго краю”.

9. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення заключных мерапрыемстваў моладзевага выставачнага праекта “Казкі і паданні майго краю” ці іх адмены па аб’ектыўных прычынах удзельнікі мерапрыемства будуць паведамлены індывідуальна.

10. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:
“жывапіс”;
“графіка”;
“дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”.

11. Конкурсныя работы, прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс, павінны быць выкананы акуратна, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі, быць творчымі і арыгінальнымі ў тэматычным плане, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў. Магчыма эксперыментаванне з матэрыяламі.

12. Прадстаўленыя на Выстаўку-конкурс работы неабходна суправаджаць тлумачальнай запіскай з указаннем назвы работы; прозвішча, імя, імя па бацьку; узросту аўтара; матэрыялу і тэхнікі

выканання работы; поўнай назвы ўстановы, якая прадстаўляе канкурсанта; кароткім апісаннем мясцовай легенды, падання, літаратурнага твора і інш.

13. Вынікі Выстаўкі-конкурсу журы (дадатак 2) падводзіць асобна па кожнай намінацыі ў дзвюх узроставых катэгорыях: 1) ад 7 да 16 гадоў; 2) ад 16 да 31 года.

14. Пераможцы Выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) у рамках і прызамі.

15. Журы ўзнагароджвае асобных канкурсантаў спецыяльнымі прызамі і дыпломамі: "за глыбіню вобразнага раскрыцця тэмы"; "за арыгінальнасць кампазіцыйнага і каляровага рашэння"; "за пераемнасць народных традыцый"; "за крэатыўнае мастацкае мысленне"; "за інтэрпрэтацыю народных традыцый у творчасці"; "за эксперыментаванне з сучасным матэрыялам"; "прыз глядацкіх сімпатый".

16. Усе астатнія ўдзельнікі Выстаўкі-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

17. Конкурсныя работы лаўрэатаў (I, II, III ступені) не вяртаюцца аўтарам і застаюцца ў выставачных фондах ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

18. Па ўзгадненні з аргкамітэтам журы мае права прысудзіць у адной намінацыі некалькі дыпломаў лаўрэата II, III ступені з адпаведнымі прызамі ў рамках агульнага прызавога фонду альбо не прысвойваць месцы ці аб'ядноўваць намінацыі.

19. Для ўдзелу ў 1 этапе Выстаўкі-конкурсу неабходна да 29 сакавіка 2021 года даслаць заяўку (Дадатак 3) і фотаздымкі выставачных работ (не больш 3-х) на электронны адрас ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці": omcnt@mail.grodno.by

20. Аргкамітэт адбірае работы канкурсантаў і дасылае афіцыйныя запрашэнні для ўдзелу ў 2 этапе Выстаўкі-конкурсу.

21. Для ўдзелу ў 2 этапе Выстаўкі-конкурсу конкурсныя работы неабходна даставіць да 5 красавіка 2021 года па адрасе: г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". Даведкі па тэл.: +375 152 687934, 623792, 623784.

22. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі па дастаўцы выставачных работ ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючай арганізацыі.

23. Фінансаванне Выстаўкі-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

24. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, рамак для дыпломаў, выраб дыпломаў, ралапаў (рэкламных стэндаў), паслугі па музычным афармленні і гукаўзмацненні,

транспартныя паслугі, арэнда шатроў-трансформераў, аплата працы вядучым, пакрыццё камунальных паслуг.

25. Для фінансавання Выстаўкі-конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва "Казкі і паданні майго краю"

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва "Казкі і паданні майго краю"

| | | |
|---|---|---|
| Куратчык С.В. | - | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня аргкамітэта; |
| Мурэня А.У. | - | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Грыгаран Т.У. | - | намеснік дырэктара ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Пятрук А.П. | - | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Барысевіч Я.А. | - | загадчык аддзела традыцыйнай культуры ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці". |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

СКЛАД ЖУРЫ
абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

| | |
|---|---|
| Бандарчук М.Т. | Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, старшыня абласной арганізацыі “Беларускі саюз мастакоў”, выкладчык УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”, старшыня журы; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня журы; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, намеснік старшыні журы; |
| Аўчыннікаў А.Ф. | народны майстар Рэспублікі Беларусь, мастак; |
| Барысевіч Я.А. | загадчык аддзела традыцыйнай культуры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Грыгаран Т.У. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Мурэня А.У. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выстаўкі-конкурсу дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры райгарвыканкама
2021 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласной выстаўцы-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва “Казкі і паданні майго краю”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку________________________________________
______________________________________________________________________
2. Дата нараджэння_____________________________________________________
3. Пашпартныя дадзеныя (серыя, нумар, калі і кім выдадзены) удзельніка альбо законнага прадстаўніка ________________________________
______________________________________________________________________
4. Месца жыхарства, кантактны тэлефон___________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
5. Установа культуры, навучальная ўстанова, месца працы, іншае
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
6. Работы, прадстаўленыя на выстаўку-конкурс:

| № п/п | Намінацыя | Узроставая катэгорыя | Назва работы | Тэхніка выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | |